


✓**З 24 кастрычніка ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі** працуе выстава **«Адтуліны-адсюліны»**, арганізаваная сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. У экспазіцыі – выкананыя ў жывапісе, графіцы, дэкаратыўным мастацтве работы беларускіх мастакоў Юрыя Пяткевіча і Ірыны Князевай.

Выстава «Адтуліны-адсюліны» знаёміць гледача з сучасным беларускім інсітным мастацтвам, якое, па словах Ірыны Князевай, прыходзіць «адтуль і адсюль, па адтулінах і адсюлінах» – нараджаецца з старадаўніх традыцый беларускай спадчыны, у паўсядзённых адкрыццях, інтуітыўных вынаходках і непасрэдных прыдумках, па вопыце і назіраннях, якія пакідаюць найбольшае ўражанне ў творчай душы.

Інсітнае мастацтва здаўна запатрабавана беларускім гледачом, аб гэтым сведчыць папулярнасць маляванак Алены Кіш, выразаных у дрэве работ Мікалая Тарасюка, краявідаў на аргаліце і размаляваных цыратаў Васіля Жарнасека, манументальных вырабаў з дрэва Івана Супрунчыка... Рысы такога мастацтва выкарыстоўвалі сусветна вядомыя мастакі – Марк Шагал, Пабла Пікаса, выкарыстоўваюць і

сучасныя беларускія аўтары – Валянцін Губараў, Марта Шматава і інш.

Юрый Пяткевіч – мастак, паэт, пісьменнік – прапануе ўвазе гледачоў унікальныя спалучэнні выяўленчага і літаратурнага мастацтва, прыклады элітарнага напрамку кніжнага мастацтва – Кнігі Мастака (Livre d'artiste), выкананыя ў графіцы і жывапісе. Творчасць Ірыны Князевай прадстаўлена яе ілюстрацыямі да выданняў беларускай дзіцячай пісьменніцы Таццяны Дашкевіч «Аблокі для Мілы», «Куды бяжыць сабака Мелі?» і «Сталец ніколі не рана, або Адзін неверагодны дзень з жыцця звычайнага хлопчыка». Вясёлыя, непасрэдныя работы пераносяць у дынамічную прастору дзіцячых гульняў, адкрыццяў і пошукаў.

Выстава будзе працаваць да 10 снежня.